Казлоўская Л. І.,
канд.пед.навук,
дацэнт

# МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ НАВУЧАЛЬНАГА ПРАЦЭСУ - ВАЖНЫ ФАКТАР ПРАФЕСІЙНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ САЦЫЯЛЬНАГА ПЕДАГОГА - АРГАНІЗАТАРА ВОЛЬНАГА ЧАСУ

1. Сучасныя патрабаванні да павышэння якасці навучання ў вышэйшай школе выклікаюць неабходнасць пошуку эфектыўных шляхоў фарміравання прафесійнага майстэрства сацыяльных педагогаў - арганізатараў вольнага часу. Адным з такіх шляхоў з'яўляецца метадычнае забеспячэнне навучальнага працэсу.

2. Да цяперашняга часу ў падрыхтоўцы сацыяльных педагогаў-арганізатараў вольнага часу склалася сітуацыя, калі існуючыя вучэбныя дапаможнікі па многіх дысцыплінах ужо не адпавядаюць у поўнай меры запытам спажыўцоў. Змястоўны аналіз шэрагу падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў, што падрыхтаваны ў ВНУ, паказвае, што яны грашаць апісальнасцю, слаба ўлічваюць рэгіянальныя асаблівасці і маюць недахопы.

У гэтай сувязі шэраг выкладчыкаў кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці вядуць актыўную навукова-даследчую работу, якая заканчваецца падрыхтоўкай дысертацый, навуковых артыкулаў, метадычных дапаможнікаў. Дадзеныя, што атрыманы ў выніку такіх даследаванняў, шырока выкарыстоўваюцца ў лекцыях, на практычных і індывідуальных занятках са студэнтамі.

3. Істотнае значэнне ў прафесійнай падрыхтоўцы сацыяльных педагогаў-арганізатараў вольнага часу мае створаны на кафедры сцэнарны фонд, які ўключае культурныя праграмы па арганізацыі вольнага часу. У іх ліку інфармацыйна-публіцыстычныя; мастацка-відовішчныя; забаўляльна-гульнявыя.

Азнакамленне са сцэнарыем дае магчымасць студэнтам набываць неабходныя навыкі для стварэння і мадэліравання новых нестандартных варыянтаў культурных праграм па арганізацыі вольнага часу. Студэнты робяць метадычны аналіз сцэнарыяў па зададзенай праграме, які з'яўляецца абавязковым справаздачным матэрыялам, што падаецца на экзамен ці залік па прадмету. У будучых спецыялістаў фарміруюцца такія прафесійныя якасці, як крытычнасць мыслення, назіральнасць, уменне даць ацэнку сцэнарыю, вызначыць мэту, адшукаць метадычныя памылкі і г.д.

4. Роля створанай на кафедры гульнятэкі мае вялікае значэнне ў навучальным працэсе. Разнастайныя гульнявыя формы: атракцыёны, віктарыны, конкурсы, шарады, аўкцыёны — выкарыстоўваюцца пры вывучэнні многіх дысцыплін. Спецыяльна распрацаваная мадэль гульнявай карткі дазваляе метадычна правільна ўключаць гульні ў разнастайныя культурныя праграммы, пры гэтым улічваць жанр праграмы, аўдыторыю, месца правядзення, тэмпарытм. Гульня пры гэтым арганічна дапаўняе праграму сваімі спецыфічнымі сродкамі. Асобнае месца ў гульнятэцы займаюць беларускія народныя гульні, якіх болей за дзвесце.

5. Навучанне спецыялістаў немагчыма без выкарыстання ў навучальным працэсе тэхнічных сродкаў: магнітафонаў, відэамагнітафонаў, вучэбных фільмаў. Прымяненне такой тэхнікі дае магчымасць павысіць эфектыўнасць навучання і прадукцыйнасць працы выкладчыка, скарачае тэрміны засваення вучэбнага матэрыялу. Павышэнне эфектыўнасці навучання студэнтаў пры прымяненні тэхнічных сродкаў тлумачыцца тым, што побач са слыхавымі і мышачнамі аналізатарамі ў рабочы працэс уключаецца зрок. Шэраг выкладчыкаў кафедры з'яўляюцца аўтарамі сцэнарыяў і стваральнікамі вучэбных відэафільмаў. На кафедры маюцца відэафільмы культурных праграм, якія былі паказаны па тэлебачанні, шэраг вучэбных фільмаў зняты ў час здачы праграм студэнтамі ў цэнтры рэабілітацыі "Аксакаўшчына", школах г.Мінска, універсітэце культуры і г.д. Аднак вопыт, які маецца ў выкарыстанні ТСН, у значнай ступені трымаецца на асабістай ініцыятыве выкладчыкаў.

6. Для ўдасканалення навучальнага працэсу сацыяльных педагогаў-арганізатараў вольнага часу неабходна прымяняць шэраг мер па ўдасканаленні метадычнай дакументацыі, забеспячэнні міжпрадметных сувязей са спецыяльнымі кафедрамі факультэта.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКіМ